# РАЗДЕЛ 4
# МЕЖДУНАРОДНЫЙ ТУРИЗМ. ТАМОЖЕННОЕ ДЕЛО

## Патэнцыял і перспектывы развіцця турызму ў Ляхавіцкім рэгіёне

*Булаты П. Ю., асп. РІВШ,*
*навук. кір. Любая А. А. канд. гіст. навук, дац.*

У сучасных умовах развіцця турыстычнай індустрыі значную ролю адыгрывае рэгіянальны турызм. Тэндэнцыя агульнага развіцця міжнароднага турызму – ажыццяўленне дзейнасці менавіта на рэгіянальным узроўні. Кожны рэгіён мае ўласцівыя яму рэсурсы, асаблівасці іх размеркавання, гістарычныя рысы, структуру гаспадаркі, спецыялізацыю.

Адным з падмуркаў фарміравання турыстычных рэгіёнаў з’яўляецца гісторыка-культурная спадчына – сукупнасць помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, якая была створаная ў працэсе развіцця грамадства і мае пазнавальную каштоўнасць. Дадзены тып рэсурсаў не патрабуе прадстаўлення і прасоўвання, бо ўжо з’яўляецца ядром турыстычнага прадукту. Выкарыстанне спадчыны ў турызме прыносіць пэўны даход, з якога грошы рацыянальна выдаткоўваюцца на аднаўленне і захаванне аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, падтрыманне іх у вартым стане. Заўважым, што не ўся спадчына мінулага адносіцца да гісторыка-культурных рэсурсаў: да іх варта аднесці толькі тыя аб’екты, якія добра вывучаны, якія маюць выхаваўчае значэнне і менавіта таму могуць быць выкарыстаны для задавальнення турыстычных патрэб пэўных турыстычных груп.

У сувязі з вышэйсказаным, разгледзім гісторыка-культурны патэнцыял Ляхавіцкага рэгіёна і вызначым тэматычны кірунак турызму, як найбольш перспектыўны для развіцця ў акрэсленай мясцовасці. Акцэнт зробім на такім відзе спадчыны, як архітэктурная.

Згодна са спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (2016) на тэрыторыі Ляхавіцкага раёна знаходзіцца 11 помнікаў (у тым ліку комплексаў) розных катэгорый [1]. Турыстычны пуцяводнік (2015) прапануе пазнаёміцца з больш шырокім колам помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны (27 аб’ектаў) [2]. Найбольшая колькасць помнікаў прадстаўленая на інтэрнэт-партале Глобус Беларусі – 70 разнастайных аб’ектаў (з улікам комплексаў), якія маюць свой рэйтынг атрактыўнасці [3]. Размеркаваць помнікі рэгіёна можна па наступных групах: археалагічныя, мемарыяльныя,

культавыя, сядзібы і сядзіба-паркавыя комплексы, некропалі, шэраговая і гаспадарчая забудова. Прывядзём архітэктурныя помнікі Ляхавіцкага рэгіёна, згодна з адзначанай класіфікацыяй.

Археалагічныя: сярэднявечнае ўмацаванне ў в. Гарадзішча, курганныя могільнікі ў вёсках Гулічы, Куршынавічы і Навасёлкі.

Культавыя: праваслаўная царква ў Ляхавічах і вёсках Востраў, Дарава (дзве), Крывошын, Падлессе, Пранчакі, Свяціца; каталіцкі касцёл у Ляхавічах (два, адзін выкарыстоўваўся як паліклініка), Ліпск, Мядзведзічы, Сваятычы; капліцы ў Грушаўцы, Дарава, Ляхавічах, Макееўшчыне, Мядзведзічах, Падлессі, Савейках, Сваятычах, Шавялях; былая сінагога ў Ляхавічах.

Мемарыяльныя: месца баёў Другой сусветнай вайны ў вёсках Завінне, Курган Славы, камень паўстанцаў 1863 года ў Крывошыне, Помнік Першай сусветнай вайны, мемарыял «Ляхавіцкая фартэцыя», камяні ў Патапавічах, Брацкія магілы ў Ляхавічах, Падлессі і іншых вёсках (дакладная інфармацыя не выяўлена), фартыфікацыя Першай сусветнай вайны і 1920–1930-х гг.

Некропалі: Першай сусветнай вайны ў Вялікай Лотве, Дараве, Крывошыне, Літве, Ляхавічах, Малым Гарадзішчы; хрысціянскія некропалі з адметнымі надмагіллямі і капліцамі ў Ляхавічах, Дараве, Мядзведзічах, Сваятычах; татарскі мізар у вёсцы Туркі.

Сядзібы і сядзіба-паркавыя комплексы: Адахаўшчына, Бубноўшчына, Востраў, Голдавічы, Гаслаўшчына, Грушаўка, Дарава-Чыж, Жарскія, Каранеўшчына, Лабузы, Малышы, Мыслабаж, Нача, Нача-Свянтэцкая, Рэпіхава, Сваятычы, Савейкі, Ураджайная, Флер'янава.

Шэраговая і гаспадарчая забудова: гаспадарчая пабудова ў в. Канюхі, Крывошын, Мядзведзічы, Русінавічы, забудова Ляхавічаў, млыны ў Мядзведзічах і Патапавічах.

Такім чынам, агульная колькасць помнікаў гісторыка культурнай спадчыны Ляхавіцкага рэгіёну складае 79 аб'ектаў. Зрабіўшы аналіз рэйтынгу турыстычнай прывабнасці (па сукупнасці рэйтынгу Глобуса Беларусі, звестак пуцяводніка і катэгорыі каштоўнасці) і папярэдне агледзеўшы стан помнікаў, адзначым наступнае. Найбольш прывабным і перспектыўным аб'ектам рэгіёну для развіцця турызму з'яўляецца сядзіба Рэйтанаў у Грушаўцы, а таксама шэраг іншых аб'ектаў рэгіёна, звязаных з родам Рэйтанаў. Сядзіба Рэйтанаў на сайце Глобус Беларусі мае рэйтынг 1 (катэгорыя «убачыць абавязкова»), рэкамендаваная пуцяводнікам, мае 2 катэгорыю каштоўнасці (аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны рэспубліканскага значэння). Так, атрымліваецца наступная схема пабудовы турыстычнага прадукту: маецца галоўны атракт, які тэматычна звязваецца з шэрагам аб'ектаў, менш прывабнымі для турыстаў. Атрымліваецца турыстычны кластар. Гэта дае падставы сцвярджаць, што асновай галоўнага комплекснага турыстычнага прадукту Ляхавіцкага рэгіёну, які будзе пазіцыянаваць мясцовасць, можа быць, сукупнасць аб'ектаў, якая датычыцца роду Рэйтанаў.

**Літаратура**

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Белта. – 2009.
2. Ляховичский район. Путеводитель. [Электронны рэсурс] – Режим доступа : https://issuu.com/asplyt/docs/lyahovichi – Дата доступа : 30.03.2017.
3. Ляховичский район / Глобус Беларуси [Электронны рэсурс] – Режим доступа : http://globus.tut.by/_regs/lyahov.htm – Дата доступа : 30.03.2017.

## Сравнительная характеристика белорусских горнолыжных центров «Силичи» и «Логойск»

*Грицевич Д. М., студ. I к. БГУ,*
*науч. рук. Решетников Д. Г., канд. геогр. наук, доц.*

На сегодняшний день современное оборудование и техника позволяют создавать горнолыжные центры в равнинных странах. Примером служит создание комплексов «Силичи» и «Логойск» в Минской области Республики Беларусь, сравнительный анализ деятельности которых представлен в данной работе. Критериями для сравнения были выбраны: уровень развития инфраструктуры, ассортимент предлагаемых услуг, цены на услуги, статистика посещений за последние 3 года, отзывы клиентов, календарь событий.

При сопоставимом общем уровне развития инфраструктуры стоит выделить уникальные особенности объектов. Для РГЦ «Силичи» – наличие парка экстремального катания, универсального спортивного зала «Дом спорта», картинг-центра. В ГСОК «Логойск» – лыжно-биатлонная база, веревочный городок, площадка для автокемпинга, скалодром. Стоит отметить, что ГСОК «Логойск» планирует строительство новых объектов (летом 2017 года планируется открытие вейк-парка, также в планах строительство сноупарка).

Что касается спектра предлагаемых услуг, то в зимний период оба центра предлагают катание на горных лыжах и сноубордах, тюбингах. РГЦ «Силичи» также предлагает катание на коньках. В летний период уникальными услугами в РГЦ «Силичи» являются услуги картинг-центра, в ГСОК «Логойск» – услуги веревочного городка, скалодрома, автокемпинга.

Цены в ГСОК «Логойск» ниже, чем в РГЦ «Силичи», однако незначительно. Стоит учитывать, что в РГЦ «Силичи» склоны выше, трасс больше и они более протяженные.

По статистическим данным, предоставленным обоими комплексами, с 2014 по 2016 гг. количество посетителей РГЦ «Силичи» уменьшилось почти на 1/3 (с 105 тыс. человек до 76 тыс. в зимний период и с 22 тыс. человек до 11 тыс. в летний период), в то время как в ГСОК «Логойск» оно постепенно увеличивается (с 40 тыс. до 50 тыс. человек в месяц в зимний период). В пер-